Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Чырвоная Зьмена

№ 61 (1330) | НЯДЗЕЛЯ, 15-га сакавіка 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . 3 р. 60 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25,
сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага № —2 кап.

„Нявінная анкета“ на антысавецкую тэму

ЛЁНДАН, 12. У сувязі з тым, што полпрэд СССР у Англіі т. Броп, выкрыў факт рассылкі міжнароднай гандлёвай палатай сакрэтнага дакуманту аб організацыі антысавецкага блёку, у рэакцыйных дзелавых колах пануе замяшканьне.

Кіраўнікі брытанскай сэкцыі міжнароднай гандлёвай палаты імкнуцца прадставіць гэты дакумант, як нявінную анкету. Кіраўнікі брытанскай сэкцыі заяўляюць, што палата быццам ня мае намеру весьці свае справы патаемна і што „камітэт міжнароднай палаты“ вядзе работу па зьбіраньню інфармацыі ў сувязі з ня маючым прэтэндэнтаў становішчам.

Такім чынам, „абвяржэньне само па себе аказалася новым довадам таго, што анкета міжнароднай гандлёвай палаты мае мэтай стварыць антысавецкі байкот.

Бальшавікі павінны аўладаць тэхнікай

„Час бальшавікам самім стаць спэцыялістымі. Тэхніка ў пэрыод рэконструкцыі вырашае ўсё. І гаспадарнік, які не жадае вывучаць тэхніку, які не жадае аўладаць тэхнікай, гэта анэкдот, а не гаспадарнік“ як рашуча тав. Сталін ставіў пытаньне аб аўладаньні тэхнікай на Усесаюзнай нарадзе гаспадарнікаў.

Шпаркія крокі індустрыялізацыі нашай краіны, карэнная рэконструкцыя ўсяе народнай гаспадаркі на аснове высока разьвітай тэхнікі ставяць баявую задачу для кожнага камуністага, комсамольца, гаспадарніка, рабочага і колгасьніка-аўладаць тэхнікай і навукай, стаць з прыдатка машыны культурна-тэхнічным кіраўніком. Нашу тэхнічную някультурнасьць клясавы вораг-шкоднік выкарыстоўвае для барацьбы супроць дыктатуры пролетарыяту. Аб гэтым яскрава сьведчыць шкодніцкая дзейнасьць клясава-варожых элемэнтаў спэцыялістых інтэлігентаў шахцінцаў „прампартыі“ і інш.

Таму трэба прыкласьці ўсе сілы і энэргію, каб у найкарацейшы тэрмін дасягнуць рашаючых посьпехаў у галіне аўладаньня навукай і тэхнікай.

Па ініцыятыве газэты „Чырвоная Зьмена“, Менскі, Барысаўскі і Віцебскі райкомы склалі пляны паходу за тэхніку. Па ініцыятыве ЦК, „Чырвонай Зьмены“ і сельска-гаспадарчай вопытна-дасьледчай [illegible] станцыі разгорнута работа па вызначэньню конкрэтных мерапрыемстваў аўладаньня агротэхнікай.

Трэба аўладаць тэхнікай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі, яе спэцыялізацыяй у напрамку разьвіцьця жывёлагадоўлі сьвінагадоўлі, тэхнічных культур (лёну, канапель) сада-гародніцтва. Аўладаць тэхнікай трактару і іншых сельска-гаспадарчых машын, мэханізацыяй і (хэмізацыяй) сельскай гаспадаркі. Аўладаць марксысцка-ленінскім вучэньнем аб эканоміцы і структуры арганізацыі буйных соцыялістычных гаспадарак савгасаў і колгасаў.

Сёньня „Чырвоная Зьмена“ да пленуму ЦК ЛКСМБ высоўвае рад конкрэтных мерапрыемстваў у барацьбе за асваеньне комсамолам навукай і тэхнікай у прамысловасьці. Трэба, каб нашы прапановы зьявіліся об'ектам актыўнага абгаварэньня ўдзельнікамі пленуму.

На аснове рашэньняў пленуму ўся камсамольская організацыя, кожны комсамолец паасобку павінны з бальшавіцкай настойлівасьцю ўключыцца ў бой за аўладаньне тэхнікай. Выкарыстаўшы ў сваёй практычнай дзейнасьці ўсе формы і мэтады масавай працы, комсамол справіцца з гэтай задачай.

Устанавіць у пяцідзёнку адзін дзень для ліквідацыі тэхнічнай няпісьменнасьці, організаваць гурткі па вывучэньню тэхнікі па асобных галін гаспадаркі, выкарыстаць радыё, кіно, чытку лекцый па асобных тэмах, выкарыстаць мэтод правядзеньня гутарак з рабочай і колгаснай моладзьдзю ў абедзеныя перапынкі, практыкаваць вечары навукі і тэхнікі—вось шляхі, па якіх комсамол павінен змагацца за ўцягненьне шырокіх мас комсамольцаў і працоўнай моладзі ў паход за аўладаньне тэхнікай.

Комсамол з гонарам выканае задачу аўладаньня тэхнікай і агротэхнікай. Трэба толькі, каб гаспадарчыя, профсаюзныя і савецкія організацыі, а таксама нашы перадавыя спэцыялістыя, інжэнэры, тэхнікі, агрономы актыўна дапамаглі комсамолу ў яго штодзённай практычнай рабоце і дапамагалі ня толькі размовамі, а практычным удзелам, конкрэтнымі справамі. Трэба, каб Белдзяржвыдавецтва забясьпечыла комсамольскі маладняк папулярна тэхнічнай літаратурай. Узброіла ўдарніка-энтузіястага тэхнічнай літаратурай.

У баёх на ўсіх фронтах соцыялістычнага будаўніцтва комсамол пад кіраўніцтвам партыі паказаў увесь размах сваіх творчых здольнасьцяй. Комсамол кідаў свае сілы з аднаго цяжкага вучастку на другі і дабіваўся перамог над прарывамі. А зараз яго задача ліквідаваць той прарыў, які маецца між гаспадарчай працай і творчай думкай. Далучыць творчую думку да ўдарнай працы. Для соцыялістычнай сельскай гаспадаркі мала павышаць нормы выпрацоўкі напружваньнем цягліц і мускулаў, трэба перабудаваць усю вытворчасьць

Заваяваць тэхніку.

Дэлегацыя шэфу выяжджае на лінкор „Парыская Комуна“

Для удзелу ў сьвяткаваньні 7-ай гадавіны падшэфнага Камсамолу Беларусі лінкору „Парыская Камуна“ на лінкор выяжджае дэлегацыя ЛКСМБ у складзе 28 асоб.

У дэлегацыю уваходзяць прадстаўнікі Віцебскай, Менскай, Аршанскай. Гомельскай, Пухавіцкай, Мазырскай, Жыткавіцкай, Рагачоўскай, Барысаўскай і Дрысенскай арганізацый.

Рэчыцкая, Гарадоцкая Магілеўская, Бабруйская, Прапойская і Полацкая арганізацыі не прыслалі прадстаўнікоў не сабраўшы сродкаў на пасылку дэлегатаў.

У склад прэзыдыуму дэлегацыі уваходзяць т. т. Гуткін, Платаў, Казлоў, Вайнштэйн і Фрумкіна.

Дэлегацыя вязе сабраныя Камсамолам Беларусі сродкі на культурныя патрэбы асабістага складу падшэфнага лінкору ў суме 5,5 тысяч рублёў і падарункі ад комсамольскага шэфу.

Рабочыя супроць капіталістычнай рацыяналізацыі

ЛЁНДАН, 12. Забастоўка рабочых джутавых фабрык у Кальцуце працягваецца з непаслабнай сілай.

Масавае інспэкцыяваньне джутавых фабрык выклікала рад сутычак паміж рабочымі і паліцыяй, якая арыштавала да 100 рабочых.

Хваляваньне кульцуцкіх рабочых распаўсюджваецца на іншыя раёны Індыі. У Бародзе забаставала тысяча тэкстыльшчыкаў, у Ахмэдабадзе —3000 рабочых протэстуюць супроць капіталістычнай рацыяналізацыі.

II пленум ЦК ЛКСМБ

Узмацніць работу комсамола на фронце рабочага забесьпячэньня

Ранішняе паседжаньне 2-га пленуму ЦК ЛКСМБ, 14-га сакавіка, адчыніў тав. Палякоў.

Тав. Курган, які першым выступіў у спрэчках па дакладу аб рабочым забесьпячэньні і ўдзеле ў ім комсамолу, расказвае пленуму пра ганебныя факты ў справе вядзеньня прыгарадных гаспадарак.

— У 7-мі кілёмэтрах ад Менску маецца садова-гародная арцель,—гаворыць Курган,—але гэтая арцель не забясьпечана яшчэ да сёнешняга дню насеньнем, не падрыхтавана да закладкі парніковых рам. Ідуць гутаркі, спрэчкі, як быць, які ўхіл павінен быць у арцелі, а справы яшчэ няма, хаця вясна ўжо наступае.

Акрамя гэтага тав. Курган заастрае ўвагу пленуму на справе мясазагатовак.

— Касьцюковіцкі, Лупалаўскі і шэраг іншых раёнаў, яшчэ нават не загатовілі ніводнага кілё мяса.

Замест жаночых панчох—мужчынскія порткі.

Нэйдлін, дэлегат з Віцебску, расказвае пленуму факты аб выпадках, калі па 3-4 дні ня прывозілі ў магазын хлеба і рабочыя не маглі яго дастаць. Тав. Нэйдлін прыводзіць факт, калі ў магазыне, дзе пераважна бяруць жанчыны, прадаюць замест жаночых панчох мужчынскія порткі.

— І цяпер,—гаворыць ён,—аб падрыхтоўцы кадраў. Тут справа абстаіць надзвычайна дрэнна. У Віцебску праца ФЗВ кулінараў пад пагрозай зрыву, бо ні кооперацыйныя організацыі, ні іншыя ня ідуць насустрач. Тав. Сарноў, дэлегат Аршанскага чыгуначнага вузлу расказвае аб пастаноўцы справы забясьпечаньня чыгуначнага транспорту. Ён адзначае шэраг недахопаў, асабліва завастрае ўвагу на непаваротлівасьці ЦРК, на адставаньні яго апарату.

— Тры дні Асінторфу ня было пасла на хлеба, з-за чаго была пагроза астаноўкі раённай станцыі Асінбуду.

Гомельскі дэлегат тав. Петленка гаворыць аб ролі друку і ў прыв-атнасьці „Чырвонай Зьмены“ ў справе рабочага забесьпячэньня.

— Газэты, у тым ліку і „Чырвоная Зьмена“, зусім мала ўдзяляюць увагі мобілізацыі комсамолу на палепшаньне рабочага забесьпячэньня.

—Што я, агроном?

Сакратар Гомельскага гаркому комсамолу тав. Камісарчык расказвае аб становішчы рабочага забесьпячэньня ў Гомельскім раёне і ўдзелу ў гэтай справе комсамолу Гомельшчыны.

— Па нашай організацыі,—гаворыць ён—мы ніводнага разу не заслухалі комсамольцаў, працуючых у магазынах.

Побач з гэтым таварыш Камісарчык прыводзіць факт з працы вясковага комсамолу на фронце забесьпячэньня.

— У саўгасе Васільеўск (Гомельскі раён) быў падзеж сьвіней. Комсамол ніякай увагі ня ўдзяліў гэтаму, а калі запыталі ў сакратара комсамольскага колектыву, як абстаіць у яго справа, ён адказаў:

— Што я аграном, ці што? Не мая справа ведаць кантрольныя лічбы і колькі навозу трэба вывезьці.

Замест змазачных продуктаў—пудра і духі

Таварыш Худаш прыводзіць факты самазабясьпечаньня комсамольца, працуючых у коопэрацыі Пухавіцкага раёну.

— Не пасьпяваюць,—кажа ён,—прыбыць расцэнкі на тавары, як тавары ўжо разьмеркаваны паміж сваімі.

Выступіўшы тав. Бахноўскі адзначыў адставаньне работы коопэрацыі ад запатрабаваньняў соцыялістычнага будаўніцтва і нягібкасьць коопэрацыйнага апарату.

— Колгасу патрэбны змазачныя продукты, а коопэрацыя набывае пудру і духі.

Таварыш Рудэнбэрг завастрае ўвагу дэлегатаў пленуму на птушкаводзтве, кролікаводзтве і ўдзеле ў гэтай справе піонэраў.

Побач з гэтым ён расказвае пленуму аб безгаспадарнасьці апарату коопэрацыі Сіроцінскага раёну.

— У нашым раёне,—кажа ён,—з-за непаваротлівасьці і бесгаспадарнасьці коопэрацыі інвэнтар па апрацоўцы малака валяецца і іржавее, а малако не апрацованае ідзе рабочым Віцебску.

У спрэчках выступіў прадстаўнік ЦК УсеЛКСМ тав. Баршэньнік які застанавіўся на недахопах працы комсамолу на гэтым вучастку і далейшых задачах.

Усе выступаючыя адзначалі недастатковы ўдзел комсамольскай організацыі Беларусі ў рабочым забесьпячэньні.

Ц.

VI Усесаюзны Зьезд Саветаў

Завяршым у трэцім рашаючым пабудову фундаманту соцыялістычнай экономікі

(З пастановы VI Зьезду Саветаў Саюзу ССР па справаздачы ўраду СССР)

VI Зьезд Саветаў Саюзу ССР, заслухаўшы і абмеркаваўшы справаздачу старшыні Саветаў Народных Камісараў Саюзу ССР В. М. Молатава (Скрабіна) аб рабоце ўраду Саюзу ССР за пэрыод з V па VI Зьезд цалкам ухваляе замежную і ўнутраную політыку ўраду.

З часу мінулага зьезду саветаў адбыліся вялізарнейшыя зьмены ў суадносінах клясавых сіл унутры Саюзу ССР і міжнародным становішчы.

Наперакор „прароцтвам“ ворагаў і ня гледзячы на бязупынныя спробы з іх боку шалёнай барацьбы з савецкай уладай, наперакор сумненьням і дробна-буржуазнаму няверʼю опортуністых,—у нашай краіне пытаньне аб перамозе соцыялізму вырашана, і перамога соцыялізму ў Саюзе ССР цалкам забясьпечана.

Зьезд лічыць буйнейшай заслугай савецкай улады, што, ня гледзячы на простыя провокацыі варожых замежных імпэрыялістычных сіл, як, напрыклад, напад на Усходня-Кітайскую чыгунку, намаганьнямі савецкай улады ў самых цяжкіх умовах было забясьпечана захаваньне міру і ўзмацненьне міжнароднага становішча Саюзу ССР.

Зьезд аддае сабе ясны адказ у бязупынным росьце ваеннай пагрозы і разам з тым прызнае, што ва ўмовах паглыбляючагася крызісу і ўсё больш нарастаючай няўстойлівасьці ў капіталістычных краінах, пры адначасовым узмацненьні экономічнай і політычнай магутнасьці Савецкага Саюзу, узброены напад на СССР, азначае зараз галоўную небясьпеку для тых, хто пасьмее парушыць мір і напасьці на Савецкі Саюз.

Зьезд абавязвае ўрад Саюзу ССР прыняць цьвёрдыя меры да абмежаваньня імпорту з тых краін, якія, замест сапраўднага ўзмацненьня гаспадарчых адносін з Савецкім Саюзам, праводзяць меры зрыву савецкага экспорту, прыкрываючыся фальшывымі легендамі аб „прымусовай працы“.

Інтарэсы далейшай соцыялістычнай рэконструкцыі нашай гаспадаркі канчатковае замацаваньне перамог над клясным ворагам, інтарэсы хутчэйшай ліквідацыі цяжкасьцяй, якія месьцяцца ў нашай адсталасьці і някультурнасьці, затрымліваюць разьвіцьцё соцыялістычнай гаспадаркі і палепшаньне дабрабыту працоўных мас, інтарэсы забясьпечаньня дзяржаўнай незалежнасьці і далейшага разьвіцьця Саюзу ССР патрабуюць бязумоўнага забясьпечаньня прынятых савецкаю ўладаю тэмпаў індустрыялізацыі і колектывізацыі. Пытаньне аб тэмпах набывае рашаючае значэньне для бягучага пэрыоду. Барацьба супроць правадзімых савецкай уладай тэмпаў, зьяўляецца наибольш характэрнай рысай опортунізму-агентуры нашага клясавага ворага.

Для выкананьня прамфінпляну бягучага году неабходна ўсямернае напружаньне сіл рабочае клясы, далейшае разьвіцьцё ўдарніцтва і соцыялістычнага спаборніцтва і ўздым іх на вышэйшую ступень, уздым вытворчасьці працы, узмацненьне працоўнай дысцыпліны, шырокае разьвіцьцё мэханізацыі, стварэньне кадраў кваліфікаванай рабочай сілы і спэцыялістых, аўладаньне тэхнікай, якая зьяўляецца крыніцай вырашэньня асноўных задач разьвіцьця нашай соцыялістычнай індустрыі на сучасным этапе.

Дасягнуты ўжо намі ўзровень разьвіцьця савецкай прамысловасьці стварае магутнае прадпасылкі для машынізацыі і трактарызацыі сельскай гаспадаркі, для вялізарнейшага росту савгасаў і машынатрактарных станцый, для значнага ўмацаваньня машынатрактарнай базы ў колгасах, для ўзмацненьня процэсаў колектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак пад кіраўніцтвам рабочай клясы. У колгасы ўступіла ўжо звыш 35 проц. усіх сялянскіх гаспадарак па Саюзе ССР. Колгасн е сялянства ператварылася ў асноўную, сапраўды магутную апору савецкай улады на вёсцы. Колгаснае будаўніцтва ўжо паказала з поўнай відавочнасьцю перавагу колектыўнай гаспадаркі перад аднаасобнай. На гэтай базе расьце і шырыцца прыток у колгасы, стварающа ўсе неабходныя прадпасылкі для таго, каб у бягучым годзе колгасамі было ахоплена ня менш 50 проц. усіх сялянскіх гаспадарак па Саюзе ССР.

Неабходнейшай умоваю далейшага росту і ўмацаваньня колгасаў, уцягненьня ў іх большасьці бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, канчатковага вырашэньня збожжавай, а ўсьлед за тым і жывёлагадоўчай проблемы-зьяўляецца правільная організацыя працы і ажыцьцяўленьне на справе разьмеркаваньня прыбытку ў колгасах па затрачанай працы, па ліку і якасьці работы колгасьнікаў.

Вялізарнейшыя задачы, якія стаяць перад нашай дзяржавай ва ўсіх галінах соцыялістычнага будаўніцтва, патрабуюць перабудовы ўсёй работы саветаў і савецкага апарату, паварот у іх тварам да вытворчасьці і колгаснага будаўніцтва, рашучай перамогі опортунізму і адставаньня ад бальшавіцкіх тэмпаў ва ўсёй савецкай рабоце зьверху да нізу, організацыі, суровай праверкі фактычнага выкананьня прынятых рашэньняў.

Зьезд поўнасьцю і цалкам ухваляе прынятыя ўрадам меры па перабудове работы коопэрацыі і ўсіх органаў забясьпечаньня па клясаваму прынцыпу і пад кутом погляду падпарадкаваньня ўсёй сыстэмы забясьпечаньня інтарэсам соцыялістычнага будаўніцтва і выкананьня прамфінпляну. Зьезд лічыць неабходным хутчэйшае палепшаньне ўсёй работы коопэрацыі, узмацненьне барацьбы з бюрократызмам коопэрацыйнага апарату і з недаацэнкай значэньня савецкага коопэрацыйнага гандлю.

VI Зьезд Саветаў лічыць, што цяперашні год зьяўляецца рашаючым годам у ажыцьцяўленьні ўсёй програмы пяцігодкі, што цяперашні год зьяўляецца годам завяршэньня пабудовы фундаманту соцыялістычнай экономікі Саюзу ССР.

VI Зьезд Саветаў Саюзу ССР ставіць перад рабочай клясаю і перад усімі працоўнымі Саюзу ССР задачу ажыцьцяўленьня ня больш як на працягу цяперашняга дзесяцігодзьдзя, лёзунгу-дагнаць і перагнаць у тэхніка-экономічных адносінах перадавыя капіталістычныя краіны.

Старшыня VI Зьезду Саветаў Саюзу ССР М. Калінін.

Сэкратар VI Зьезду Саветаў Саюзу ССР А. Енукідзэ.

ТЭХНІКА×ТЭМПЫ+ЯКА

АЛГЭБРУ БАЛЬШАВІЦКІХ СПРАЎ

„...патрабуюць ад нас ня толькі абавязкі перад рабочымі і сялянамі СССР. Гэта патрабуюць нашы абавязкі перад рабочай клясай ўсяго сьвету...“ (СТАЛІН)



ПЕРШЫЯ КРОКІ

Комсамолія „Бальшавіка“ выступіла ў паход за тэхніку.

Комсамольская ячэйка мэханічнага цэху арганізавала гурток тэхнічных ведаў, у які ўваходзяць у большасьці чорнарабочыя. Кіраўнік амаль штодзенна займаецца з удзельнікам гуртка.

Ячэйка ЛКСМБ 2 хромавага цэху арганізавала тэхнічны гурток пад кіраўніцтвам інжынэра. У гурток увайшло 18 чалавек комсамольцаў і рабочай моладзі. Зацікаўленасьць ў рабоце гуртку надзвычайна вялікая і гэта сьведчыць аб тым, што комсамол не на словах, а на справе аўладае тэхнічнымі ведамі.

Зараз ужо распрацавана конкрэтная праграма, па якой вызначана арганізаваць тэхнічныя курсы для рабочых па скуранай прамысловасьці, па вывучэньню машын і ўнядрэньню рабочых у заводчы скураны інстытут. Ужо зараз пяць чалавек пачалі заняткі ў гэтым інстытуце.

Мінкін.

На абутковай ня турбуюцца

Паход за тэхніку на Менскай абутковай фабрыцы праходзіць на-за ўвагай грамадзкіх організацый. Сталінскі заклік не даведзен да рабочае масы.

Адміністрацыя фабрыкі абмяжоўваецца організацыяй для адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсоналу курсаў па вывучэньню тэрмінолёгіі вытворчасьці. Аднак, і гэта яшчэ не прарэдзена ў жыцьцё.

Пытаньнем ахопу рабочых тэхнічнымі гурткамі ніхто не займаецца, ня гледзячы на тое, што на нашай фабрыцы з-за тэхнічнай няпісьменнасьці рабочых у значнай ступені ісуецца якасьць продукцыі. Частыя хомкі машын зьяўляюцца лепшымі паказальнікамі неабходнасьці ўзброеньня рабочых тэхнічнымі ведамі.

Тэхнічнай літаратурай бібліотэка і партгабінэт не забясьпечаны.

Ажыцьцяўленьне паходу за тэхніку такімі марудлівымі тэмпамі—зьяўляецца недапушчальным.

Шафран.

ПАХОД ЭНТУЗІЯЗМУ, ЭНЭРГІІ, ІНІЦЫЯТЫВЫ

НАШЫ ПРАПАНОВЫ ПЛЕНУМУ

Кіраваць гаспадаркай, будаваць фабрыкі і заводы, перавышаючыя па памерах і абсталяваньню ўсё, што бачыў да гэтуль сьвет, утварыць упяршыню за ўсю гісторыю чалавецтва буйную сельска-гаспадарчую соцыялістычную вытворчасьць—усё гэта патрабуе таго, каб самі бальшавікі, самі рабочыя асвоілі навуку вытворчасьці, аўладалі тэхнікай

Аўладаць тэхнікай—гэта значыць разьвіць найшырачэйшы рух сьмелай рацыяналізатарскай думкі, каб усьлед за Карташовым, Касаўравым, Філімонавым, гэтымі рэволюцыянэрамі ў справе машыннай здабычы вугля, у нас ва ўсіх галінах прамысловасьці зьявіліся сотні і тысячы такіх наватараў, якія падвойваюць і патройваюць вытворчасьць існуючых машын і ўтвараюць новыя, больш вытворчыя мэханізмы.

Аўладаць тэхнікай—гэта значыць выканаць плян рашаючага году пяцігодкі і, значыцца, наперакор усім клясавым ворагам, наперакор іх агентам, опортуністам, закончыць пяцігодку не ў 4, а ў асноўных галінах прамысловасьці—ў тры гады.

Комсамольскі паход за аўладаньне тэхнікай павінен складацца з зьліцьця двух магутных патокаў: энтузіязму, актыўнасьці, энэргіі і барацьбы за тэхнічныя веды, за соцыялістычную рацыяналізацыю вытворчасьці.

У буйнейшых раённых цэнтрах БССР патрэбна стварыць мэтадычна консультацыйныя базы па пераняссеньню вопыту тэхнічнай пропаганды у прыватнасьці, неабходна ў бліжэйшыя дні рэорганізаваць Менскі Дом Комсамолу у „Дом навукі і тэхнікі“.

Спэцыяльныя габінэты тэхнікі і электрыфікацыі павінны быць створаны пры кожным заводзе, фабрыцы, клюбе.

Неабходна выпрацаваць спэцыяльны тэхнічны мінімум ведаў для кожнага комсамольца, ўвязаўшы гэта з тэхнікай асобных галін вытворчасьці.

У машына-будаўніцтве—дабівацца лепшай спэцыялізацыі вырабаў, шырока ўнядрыць электразварку, націснуць на экономіі мэталяў, асабліва каляровых, шляхам замены іх чорнымі і біметалямі.

На новабудоўлях—экономія будаўнічых матар'ялаў, ўнядрэньне новых мэтодаў будаўніцтва, сваячасовае асваеньне абсталяваньня.

Мы лічым, што барацьба за стандартызацыю будаўніцтва, мэханізацыю яго і выкарыстоўваньне мэханізмаў павінна стаць баявой задачай будаўнічага комсамолу.

На чыгунцы—барацьба за здаровы паравоз, за мэханізацыю пагрузкі і разгрузкі за экономію апалу. Неабходна шляхам вывучэньня ўсіх магчымасьцяй, разгортваньня плянавасьці дамагацца найхутчэйшага ўжыцьця мэтоду японскага рамонту цягнікаў, і форсіраваным тэмпам працягваць барацьбу за спараную язду.

У галіне барацьбы за якасьць мы лічым, што скразны соцыялістычны конвэер якасьці, які праводзіцца па скуранай прамысловасьці і падхоплен колектывам ЛКСМБ „Чырвоная Бярэзіна“, павінен быць ператворан ва ўсебеларускі соцыялістычны конвэер якасьці па ўсей прамысловасьці.

Соцыялістычнае пляпаваньне павінна зьявіцца магутнейшай зброяй у барацьбе за выкананьне пяцігодкі Гэта адсталы вучастак ЛКСМБ. патрэбна ліквідаваць шляхам організацыі плянава-опэрацыйных груп, узброеных тэхнічнымі ведамі па прадпрыемствах, у цэхах, у варштатах. шляхам аўладаньня плянаваньнем усёй краіны, стварэньнем юнсэкцыі пры Дзяржпляне, у задачы якой павінна ўвайсьці кіраўніцтва, удзелам комсамолу ў пляньваньні.

Дзяржплян павінен распрацаваць пяцігадовы плян тэхнічнай пропаганды, які павінен увайсьці складанай часткай у агульны плян культурнай пяцігодкі.

„Неабходна помніць, што ў цэлым шэрагу выпадкаў наша існуючае абсталяваньне не ўступае такому-ж па прадпрыемствах Англіі, Францыі, Нямеччыны, але дае ў гэй-жа час больш нізка вытворчы эфэкт. Для пабудовы соцыялізму з старога абсталяваньня трэба выжаць усе, што яно яшчэ можа даць. Барскім нядбайным адносінам да старога абсталяваньня трэба даваць рашучы адпор. (З пастановы прэзыдыуму ВСНГ СССР аб кантрольных лічбах на 1931 год).

На падставе гэтага, мы лічым, што беларускі комсамол, які ўключаецца ў паход за тэхніку, павінен ўзяць баявое шэфства над варштатам. Мы павінны і можам на нашых варштатах перагнаць Ангельшчыну Францыю, Нямеччыну!

Трэба, каб кожны комсамолец вывучаў свой варштат, адказваў за яго і яго продукцыйнасьць! Неабходна дамагчыся пагалоўнай паспартызацыі варштатаў, змагаючыся за рацыянальнае найбольш іх выкарыстаньне.

„Рацыянальнае выкарыстаньне варштату ўяўляе сабою складаную справу, якая залежыць ад надзвычайна вялікай колькасьці прычын. Адны з гэтых прычын можна аднесьці да гэтых умоў, у якіх працякае ўся вытворчасьць. Другія адносяцца непасрэдна да варштату і інструманту, трэція-да працуючага на варштаце, наколькі выкарыстоўваньне гэтага варштату ў большай меры залежыць ад уменьня працуючага“ (проф. Орэнтліхар).

Гэтыя тры прычыне павінны быць навучаны і пераможны комсамолам!

Інжынэрна-тэхнічныя сілы, высока-кваліфікаваныя рабочыя павінны даць свае тэхнічныя веды ўдарнікам соцыялістычнай будоўлі.

Мы лічым, што Беларускі комсамол па прыкладу комсамолу Барысаўшчыны павінен заключыць дагавор з інжынэрна-тэхнічнымі сіламі БССР, якія павінны перадаць усе свае веды, навейшую навуку і тэхніку комсамолу Беларусі.

З свайго боку мы абавязваемся ў самай цеснай сувязі з інжынэрна-тэхнічнымі сіламі скарыстаць усе нашы мажлівасьці для перадачы навуковых і тэхнічных ведаў комсамольцам і рабочай моладзі Беларусі.

З бліжэйшых дзён мы пачынаем сыстэматычнае выданьне тэхнічных старонак і консультацыі, скарыстоўваючы газэтную плошчу для штурму цытадэлі тэхнікі.

„Кажуць, што цяжка аўладаць тэхнікай. Няпраўда. Няма такіх цытадэляй, якіх бальшавікі ня здолел.-б узяць.. Галоўнае тут у тым, каб мець палкае бальшавіцкае жаданьне аўладаць тэхнікай, аўладаць навукай вытворчасьці“ (Сталін).

Цытадэль тэхнікі будзе ўзята!



Варштат—пашэфны комсамолу

ВАРАШЫЛАЎЦЫ Ў ПАХОДЗЕ

Адным з першых мерапрыемстваў, праведзеных комсамолам заводу імя Варашылава ў паходзе за тэхніку, зьяўляецца конфэрэнцыя моладзі сумесна з інжынэрна-тэхнічным пэрсоналам па гэтаму пытаньню.

Зараз ужо арганізаваны і прыступілі да працы тэхнічныя гурткі: у

За лепшае наведваньне гуртка і пасьпяховасьць ударнікі будуць прэміяваны.

Зараз на заводзе праходзіць кампанія па распаўсюджваньню тэхнічнай літаратуры сярод рабочай моладзі.

Перабудавана работа цэхавых бібліотэк, якія папоўнены ў значнай ступені тэхнічнай літаратурай.

Плянава-опэрацыйныя групы прыступілі да вывучэньня тэхпромфінплянаў і чарцяжоў.

Аўладаньне тэхнікай—адзін з асноўных пунктаў конкурсу за пераходны сьцяг колектыву КП(б)Б паміж брыгадамі.

Бюро комсамольскага колектыву падтрымлівае ініцыятыву колектыву заводу „Комунар“ аб адчыненьні ў Менску вячэрняга ВТНУ з мэханічным факультэтам і прапануе організаваць пры клюбе мэталістых пакой „навукі і тэхнікі“, наваокол якога гуртаваць увесь тэхнічны актыў.

Гельфанд, Галадзец

Тэхнікум не ў паходзе за тэхніку

Абвешчаны ІХ зьездам УсеЛКСМ паход за тэхніку не пачуты комсамольскай ячэйкай і спэцыялістамі-выкладчыкамі Менскага політэхнікуму сувязі.

Выкладчыкі важнейшых дысцыплін, тэлефоніі і тэлеграфіі не зьяўляюцца на лекцыі.

Комсамольская ячэйка павінна зараз-жа ўзяцца за пытаньнем конкрэтнага праламленьня ў жыцьцё паходу за тэхніку, ажыцьцявіўшы яго перш за ўсё ў нашым тэхнікуме.

Рыг. М-к

КАМАНДЗІРЫ ПРАМЫСЛОВАСЬЦ



Інжынэры-тэхнікі т.т. Міхайлава, Жыткоўская і Застэнкер

ЗАКЛІК БУДАУНІКОУ

Выкананьне гіганцкіх плянаў 3-га, рашаючага году пяцігодкі патрабуе ад нас максімальнага падвышэньня тэмпаў сваёй працы. Гэта немагчыма без аўладаньня тэхнікай.

„Тэхніка ў пэрыод рэконструкцыі вырашае ўсё“ (Сталін).

Ленінскі комсамол абвясьціў паход за тэхнікай. Не павінна быць ніводнага комсамольца, ударніка, які-б ня ведаў асноў тэхнікі.

Комсамольскі колектыў Белдзяржбуду, уключыўшыся ў паход за тэхніку, зварочваецца да ўсіх спэцыялістых, інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў будаўніцтва:

— Мы заклікаем вас на пабудовы, ва ўдарныя брыгады для ліквідацыі тэхнічнай няпісьменнасьці.

— Пры вашай актыўнай дапамове комсамол і ўся рабочая моладзь аўладае плянам, чарцяжом, рацыяналізацыяй, мэханізацыяй будаўніцтва.

— Мы заклікаем вас для кіраўніцтва плянава-опэрацыйнымі групамі, гурткамі, брыгадамі па вывучэньню тэхнікі.

— Пры вашым удзеле мы яшчэ больш узьнімем продукцыйнасьць працы, зьнізім сабекошт будаўніцтва, навучымся больш экономна скарыстоўваць матар'ялы, будзем сачыць за поўнай нагрузкай мэханізмаў.

— Пры вашай дапамозе ў справе аўладаньня тэхнікай мы зможам выканаць і перавыканаць колькасныя і якасныя паказальнікі будфінпляну.

Вы павінны дапамагчы комсамолу і рабочай моладзі аўладаць тэхнікай будаўніцтва.

Цытадэль навукі і тэхнікі павінна быць узята.

Бюро колектыву ЛКСМБ БЕЛДЗЯРЖБУДУ

АСЬЦЬ—НАС НЕ САМНУЦЬ

АЛА БЫЦЬ УДАРНІКАМ НА ПОЛІ, ТРЭБА ВЕДАЦЬ ПОЛЯ ОРГАНІЗМ

Раніцкі (ЦК ЛКСМБ)

Асвоіць тэхніку сельскай гаспадаркі

ясковы комсамол павярнуўся ў ас ўным тварам да задач рэкон ст кцыі сел скай гаспадаркі, але на ашаючых вучастках працы—пл аваньне, рацыяналізацыя, дась ле асьць і вынаходзтва,—комсамол уд льнічае яшчэ слаба. Слабасьці гэй працы ў тым, што вясковы ко амолец ня мае нават мінімаль не тэхнічных і агранамічных ве ў.

рэба дапамагчы вясковаму комса льцу асвоіць тэхніку організа цы буйнай соцыялістычнай гаспада і, тэхніку організацыі працы, пр вільнай расстаноўкі сіл, даць ве па рацыяналізацыі работы ў са асах, колгасах.

нас зараз разгортваецца будаўні ва трактарных станцый і на пр цягу 2-3 год у кожным раёне бу е пабудавана машынна-трактарна станцыя. Сельская гаспадарка рэ нструктуецца на базе мэханіза ыі. Адсюль задача вясковага ко самольца: асвоіць машыну, умець ня голькі на ёй працаваць, але ўм ь даць найвышэйшыя паказчыкі вытворчасьці працы, як мага мен псаваць машыну.

Беларусь зьяўляецца ў асноўным жывёлагадоўчай краінай і комсамольцу неабходна мець мінімум тэхнічных ведаў—па догляду за сьвіньнёй, буйнай рагатай жывёлай і іншымі відамі дробнай жывёлы, умець атрымаць ад іх, як мага больш прыбытку, мець як мага менш страт.

Далей стаіць пытаньне адносна асваеньня агромінімуму разьвіцьця тэхнічных культур, садоўніцтва,

...А нас многа

гародніцтва, паляводзтва і г. д. і апошняе—гэта хэмізацыя сельскай гаспадаркі. Тут у асноўным задача комсамолу зводзіцца да таго, каб ведаць сродкі барацьбы са шкоднікамі, ведаць дзе, як і якое магчыма ўжываць угнаеньне для ўзьняцьця ўраджайнасьці сельекай гаспадаркі.

Спэцыялістыя павінны пайсьці насустрэч і дапамагчы комсамолу выпрацаваць конкрэтную програму паходу комсамола за аўладаньне сельска-гаспадарчай тэхнікай.

Бэкоўскі—(Інстытут соц. рэконструкцыі с-г.

72 дні ў год—на тэхнічную вучобу

омсамол зусім правільна высуну лёзунг аўладаньня сельска-гаспа рчай тэхнікай. Трэба організава і як мага хутчэй гэтую рабо .

кі-ж час патрэбен комсамолу дл аўладаньня мінімуму тэхнічных ве ў? Мне здаецца, што калі на гэ ю справу аддаць адзін дзень у пя дзёнку, а ў годзе 72 пяцідзёнкі -гэта будзе 72 дні,—за гэты ча комсамолец зможа ў асноўным аў даць мінімумам тэхнічных ведаў.

Пры складаньні програмы паходу комсамолу за асваеньне навукай і і тэхнікай трэба ўлічыць гаспадарчыя і спэцыфічныя ўмовы таго ці іншага раёну і выходзіць з задач партыі.

Нарэшце, трэба набыць веды па асваеньню самога трактару, першапачатковай перапрацоўкі с/г. продукцыі, электрыфікацыі сельскай гаспадаркі, пляну ГОЭРЛО і кооперацыйны плян Леніна.

Аарэнка—(с.-г. станцыя ЦК ЛКСМБ)

ШКМ—апорныя пункты ў паходзе

днэй з форм нашай масавай працы па аўладаньню і распаўсюджва ню агротэхнічных ведаў павінны зь іцца брыгады вопытнікаў, рацыя ізатараў і вынаходцаў. Гэтыя брыгады павінны практычна заняцца вылучэньнем паасобных галін га адаркі, вывучаць выгаднасьць та альбо іншай культуры, праве ра шы гэта на практыцы ў сваёй га адарцы. ШКМ, якія рыхтуюць кадры спэцыялістых масавай кваліфікацыі павінны разгарнуць сваю працу так, каб зьявіцца рассаднікам і організатарам масавага вопытніцтва досьледаў і вынаходніцтва ў савгасах і колгасах. ШКМ у нашых умовах павінна зьявіцца апорным пунктам у справе масавага разгортваньня працы па асваеньню комсамолам і моладзьдзю агротэхнічных ведаў.

Смірноў—(сьвінагадоўчая станцыя)

Умець захаваць маладняк

а першым месцы ў адносінах жывёлагадоўлі мы павінны паставі пытаньне выхаваньня маладня а: парасяг, цялят, індзюшат і г. . Мы ведаем, што адход маладня а ў нас вельмі вялікі, якасьць ма адняка нізкая і мы павінны п эсьці з гэтым рашучую барацьбу, п эпшыць догляд за імі і іх па р .

атым стаіць пытаньне адносна ўтыманьня дарослай жывёлы, выт рцаў, кармленьне і адкорм жыв у, нарміроўка корму, організац комбінаванага корму.

ялікую ўвагу комсамолу трэба з рнуць на будаўніцтва. У гэтым с не 25 проц. програмы будаўні тва сарвана і толькі таму, што на мясцох дрэнна дапамагалі ў гэтай працы, што ня было падрыхтоўкі да гэтай справы, а падчас і з-за шкодніцтва з боку будаўнічых організацый. Пытаньне будаўніцтва патрабуе ўвагі з боку нашых комсамольцаў.

Нарэшце, трэба даць комсамольцам веды профіляктычнага характару зоогігіенічнага характару.

Пытаньне тэхнолёгіі продукцыі жывёлагадоўлі павінна заняць вялікае месца ў тэхнічным паходзе комсамолу. Трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу на тэхнолёгію малака, сыраварэньне і масларобства. Комсамолец павінен мець веды аб падборы жывёлы, ведаць паляпшэньне гуртку і г. д.

зоўскі (НКЗБ)

ры кожнай ячэйцы—тэхнічны гурток

сноўнай формай працы па асваньню комсамолам і моладзьдзю а тэхнічнымі ведамі апрача гурт к , я прапаную організаваць пры „ рвонай Зьмене" завочныя курс консультацыі з тым, каб у к ным нумары зьмяшчаць артыкулы па адпаведных пытаньнях програмы паходу.

Трэба распрацаваць плян работы гэтых завочных курсаў пры „Чырвонай Зьмене" рэгулярна практыкаваць і зьмяшчэньне консультацыйных артыкулаў па тэхнічных пытаньнях.

Кавальчук (НКЗБ)

У ногу з навукай і тэхнікай

Самым каштоўным працаўніком у гаспадарцы зьяўляецца той, хто можа хутка і добра орыентавацца ва ўсёй гаспадарчай працы. А такім працаўніком можа быць толькі той хто добра ведае і правільна сабе ўяўляе ўсе процэсы вытворчасьці. Таму неабходна зьвярнуць увагу на асваеньне рабочымі саўгасаў і колгасьнікамі навукі і тэхнікі.

Трактар, жняяркі, касілкі, бульбакапалкі з кожным годам усё больш і больш ужываюцца ў нашай соцыялістычнай гаспадарцы, мэханізуюцца і паасобныя процэсы працы. У жывёлагадоўлі мэханізуецца скотны двор, пойла, загатоўка корму і г. д. Трэба, каб комсамолец з усім гэтым быў знаёмы.

Таксама і ў адносінах да разьвіцьця тэхнічных культур. Трэба конкрэтна кожнаму комсамольцу паказаць, якія культуры па вопыту ў нас, у БССР, больш прыемлівы, якія зьяўляюцца больш таварнымі, узброіць ведамі аб тым, дзе і якія расьліны лепш разьвіваюцца, як трэба карыстацца мінэральнымі ўгнаеньнямі. У нас-жа бываюць такія факты, калі ў раён надсылаюць угнаеньне, і там ніхто ня ведае аб тым як трэба выкарыстаць яго, што гэта за ўгнаеньне і г. д.

Спэцыялістыя павінны падтрымаць каштоўную ініцыятыву комсамолу па

сёньня ў колгасе

організацыі паходу ў агротэхніку і ўжыць усе залежачыя ад іх меры, каб дапамагчы комсамолу асвоіць агротэхніку. Адначасова комсамол павінен прыцягнуць сабе ў дапамогу сярэднія і вышэйшыя навучальныя ўстановы, тэхнікумы, ВНУ і ВТНУ.

Нарэшце, я ўношу прапанову, каб комсамольскія ячэйкі савгасаў і колгасаў вылучылі асобныя вучасткі для прахаджэньня на практыцы задачы асваеньня тэхнікаў.

У гэтым паходзе павінны прыняць актыўны ўдзел навуковыя працаўнікі і асобныя катэдры. Такі ўдзел дасьць велізарную карысьць. Напрыклад, комсамолец хоча аўладаць мэханікай па ванпаваньню глебы. Гэта справа сур'ёзная, нялёгкая і вось трэба організаваць брыгаду комсамольцаў па вывучэньню глебы пад кіраўніцтвам спэцыялістых тых катэдраў якія гэтым пытаньнем займаюцца. Організаваць такія-ж брыгады і па другіх галінах, як напрыклад, угнаеньне, тэхнічныя культуры і г. д. Організаваць лекцыі на спэцыяльныя тэмы, выезды навуковых працаўнікоў у колгасы і савгасы, што дасьць вялікую дапамогу нашым комсамольцам і беспартыйнай моладзі ў пытаньні агротэхнікі.



Малако—гораду

Дамарацкі („Чырвоная Зьмена")

Чаго чакае комсамол ад спэцыялістых

Мы спэцыялізуем сельскую гаспадарку на падставе форсіраванага разьвіцьця высока-таварных галін сельскай гаспадаркі, шляхам організацыі савгасаў і колгасаў, як сьвінаводчых, малочных, тэхнічных культур так і садова-гародніцкіх. Але шмат якія комсамольцы, моладзь і колгасьнікі вельмі мала знаёмы, а некаторыя і зусім не знаёмы з навуковымі данымі аб ўмовах правільнага разьвіцьця гэтых галін гаспадаркі. Таму галоўнае што чакае комсамол ад спэцыялістых,—гэта перадаць свае веды, ўзброіць маладога ўдарніка навуковымі і тэхнічнымі ведамі і гэтым самым даць магчымасьць пры меншай фізычнай траце энэргіі атрымаць больш высокія паказальнікі вытворчасьці працы, утварыць магчы

толькі мала ў ім

масьць з большай інтэнсыўнасьцю змагацца за рэконструкцыю сельскай гаспадаркі.

Сваю дапамогу спэцыялістыя могуць аказваць па розных лініях, але мы пакуль што абярэм дзьве: першая—прасоўваньне ў колгасы і савгасы вынікаў навуковых досьледаў. непасрэдны ўдзел у разгортваньні працы гурткоў па досьледу, вынаходніцтву і рацыяналізацыі, праз выезды на месцы, другая—выкарыстоўваньне друку для папулярызацыі дасягненьняў навукі і тэхнікі і падагульненьня вынікаў працы па досьледах, вынаходніцтву і г. д.

Мы па лініі „Чырвонай Зьмены" устанавілі раз у пяцідзёнку даваць паласу па асобных тэхнічных пытаньнях. Трэба, каб спэцыялістыя прынялі актыўны ўдзел у гэтым.

Дасканала прапрацаваўшы плян організацыі і падачы гэтага матар'ялу мы зможам аказаць комсамольскім ячэйкам, моладзі вялікую дапамогу ў справе аўладаньня тэхнічнымі ведамі.

Рэдакцыя газэты „Чырвоная Зьмена" спадзяецца, што нашы перадавыя спэцыялістыя акажуць актыўную дапамогу комсамолу ў яго барацьбе за асваеньне агра-тэхнікай.

Навука ўнядраецца ў савецкую вёску



Вэтэрынарны пункт у колгасе

Бабіцкі (Галоўленком)

Асвоім балота

У нас у БССР прыблізна каля 21 проц. ўсяе плошчы пад балотамі, а на балоцістай глебе незвычайна добра разводзяцца каноплі.

Трэба, каб комсамольцы аўладалі тэхнікай культывіраваньня балот і разьвядзеньня на іх канапель. Трэба, каб дасьледчыя інстытуты дапамаглі комсамолу ў гэтай працы і практычна паказалі, як організаваць гэта важнейшае мерапрыемства.

У паходзе за аўладаньне агратэхнікай комсамол павінен зьвярнуць увагу на набыцьцё ведаў па сілосаваньню і разьвіцьцю сілосных культур, кукурузы, сланэчніку, разьвіцьцё якіх у Беларусі дае лепшы ураджай, чым на Украіне і ў іншых мясцох.

Сьмірноў (НКЗБ)

Узяць пад кантроль працу навукова-дасьледчых установу

Асноўнімы вагарамі ўнядрэньня агротэхнікі у гушчы комсамольцаў, беспартыйнай моладзі і ўсяго працоўнага сялянства, на мой погляд, павінны зьявіцца радыё і друк. Праз друк і радыё мы павінны популя

плянавікоў...

рызаваць дасягненьні навукі і задачы аўладаньня агро-тэхнічнымі ведамі.

Разам з гэтым, трэба выкарыстаць студэнтаў і спэцыялістых сельска-гаспадарчых ВНУ і тэхнікумаў.

Мы зараз накіравалі на правядзеньне вясеньняй пасеўкампаніі каля 800 студэнтаў, з іх больш 50 проц. комсамольцаў. І вось на гэтую армію спэцыялістых трэба ўскласьці задачу організаіі вясковага комсамолу і практычна дапамагчы яму разгарнуць арготэхнічны паход за аўладаньне агротэхнічнымі ведамі.

Ужо некалькі год існуюць навукова-дасьледчыя станцыі, а ці вядомы ўсёй нашай пролетарскай грамадзкасьці маючыяся дасягненьні ў гэтай галіне? Вядома, не.

Грамадзкасьць ня ведае, чым жывуць нашы навукова-дасьледчыя станцыі, якія вынікі іх працы.

Усе дасягненьні навукі трэба шырока праламляць у працы нашых колгасаў і савгасаў.

ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ЯКАСНЫ РОСТ ПОЛІТВУЧОБЫ КОМСАМОЛУ

Павысіць політузровень—аўладаць марксызмам-ленінізмам!

IX зьезд УсеЛКСМ „адзначае вялікую політняпісьменнасьць вясковага комсамолу і недастатковую работу ў гэтым напрамку“. Зьезд падкрэсьлівае, што ў цяперашняй паласе разьвіцьця комсамолу, павышэньне тэорэтычнага ўзроўню мас. членаў УсеЛКСМ, зьяўляецца адной з рашаючых ўмоў у замацаваньні дасягнутага ў асноўным павароту тварам да гаспадарчага будаўніцтва і ў падняцьці работы на больш высокую ступень.

Адсюль—задача павышэньня політычнага ўзроўню комсамолу зяяўляецца першачарговай задачай, якую трэба паставіць ў асяродак увагі комсамолу.

Гарадзкія організацыі комсамолу павінны ўзяць шэфства над політнавучаньнем вясковага комсамолу. Гарадзкія організацыі павінны пасылаць сваіх лепшых пропагандыстых у вёску, садзейнічаць у забесьпячэньні вясковых організацый патрэбнай вучэбнай політлітаратурай, організаваць перападрыхтоўку вясковага комсамольскага актыву і г. д.

Толькі пры шчыльнай сувязі і актыўнай дапамозе гарадзкіх організацый, вясковы комсамол зможа хутка ўзьняць свой політыкаідэёвы ўзровень, будзе добра разьбірацца ў курсе міжнародных і ўнутраных падзей, ведаць політыку партыі і яе рашэньні.

У справе разгортваньня політвучобы павінны быць шырока скарыстаны мэтоды соц. спаборніцтва і ўдарніцтва, асабліва ў сыстэме завочнага політнавучаньня. Гэтая сыстэма навучаньня дае надзвычайна добрыя вынікі. Шляхам перапіскі з школамі, курсамі, слухачамі радыё-унівэрсытэту, можна дабіцца дадатных вынікаў у вывучэньні марксыцка-ленінскай тэорыі.

Раённым камітэтам комсамолу неабходна сачыць за разгортваньнем работы школ навічкоў, разьлічаных на маладых комсамольцаў; популярызаваць сыстэму політгурткоў, гурткоў бягучай політыкі і політыкавытворчых школ. На сёньня гэтая сыстэма політнавучаньня зьяўляецца асноўнай.

Тэорыяй марксызму-ленінізму павінны аўладаць шырокія комсамольскія масы. Для гэтага неабходна шырока распаўсюдзіць ленінскі 6-томнік і „Пытаньні ленінізму“ Сталіна. Па гэтай літаратуры павінны вывучаць рэволюцыйную тэорыю кожная ячэйка і кожны комсамолец.

Пашырэньню політвучобы комсамольскіх мас, падвышэньню іх ідэёвага ўзроўню павінна садзейнічаць і Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва. БДВ яшчэ ня выдала добрага комсамольскага політпадручніка, кнігі, якая-б абагульвала вопыт комсамольскай работы, па якой можна было-б комсамольцам разгарнуць тэорытычнае вывучэньне важнейшых проблем будаўніцтва і комсамольскага руху. Нават да гэтага часу няма сталага падручніка па гісторыі комсамолу Беларусі. Гэта ганебны факт. Комсамольскія організацыі бяз вывучэньня гісторыі комсамолу ня змогуць зразумець усіх асаблівасьцяй яго разьвіцьця і ўдзелу ў будаўніцтве.

У справе вывучэньня і складаньня падручніка па гісторыі комсамолу Беларусі павінны дапамагчы: Комвуз, Інстытут Марксызму-Ленінізму, адпаведныя катэдры БАН і БДУ.

Права-опортуністычным адносінам да разгортваньня комсамольскай політвучобы трэба пакласьці канец.

Ідэёвы узровень комсамольскай організацыі павінен быць павышаны.



Рыхтуюцца да промполітбою

Рыхтуюцца па ўдарнаму

Ячэйка будвучу пры БЖС разьбілася на брыгады па вывучаньню апошніх зьездаў комсамолу, партыі і яе пленумаў. Заняткі праходзяць 8 разоў у месяц. Ужо распрацавалі рашэньні X-га зьезду ЛКСМБ, IX-га усесаюзнага, XVI-га зьезду партыі і сьнежаньскага аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б).

На занятках брыгад, кіраўнік брыгады робіць уводную гутарку аб матар'яле, які трэба распрацаваць. Пасьля брыгады матар'ял распрацоўваюць самастойна. Да 15-га мая брыгады скончаць распрацоўку, і 15-га ячэйка організоўвае політбой.

Да тых комсамольцаў, якія не наведваюць політзаняткі, ячэйка прымае самыя суровыя захады. Акрамя комсамольцаў політзаняткі наведвае беспартыйная моладзь.

К.

Ленінскі шасьцітомнік не распаўсюджваюць

Ня гледзячы на рашэньні X зьезду ЛКСМБ, IX усесаюзнага зьезду і пастанову ЦК ЛКСМБ аб распаўсюджваньні 6-томніка Леніна, Дубровенскі РК комсамолу ў гэтым напрамку нічога не зрабіў.

Да гэтага часу не даведзена заданьне па выпісцы твораў Леніна да кожнай комсамольскай ячэйкі. Комсамол Дубровенскага раёну, як бачна, ня думае вывучаць рэволюцыйную тэорыю па творах У. І. Леніна. Гэтаму дапамагае і райком.

В. Цыральсон

Клюб комсамольцаў Арнсвальду

(Ліст з Бэрліну)

У паўночна-ўсходняй частцы Бэрліну, у рабочым раёне, паміж шэрымі казарменнымі будынкамі адчынен першы клюб рабочай моладзі. Некалькі ўсходняў вядуць з вуліцы ў сутарэньне, дзе знаходзіцца клюбнае памяшканьне. 4 невялікія, сьветлыя пакоі.

Вясёлы сьмех. Ігра грамафону і сьпяваньне сустракаюць кожнага, калі ён адчыніе нізенькія дзьверы. За гладка-выструганымі, нефарбаванымі сталамі на крэслах сядзяць маладыя рабочыя і работніцы. Тут і арганізаваныя і неарганізаваныя, прымыкаючыя да камуністых і нават да соцыял-дэмакратаў.

Некаторыя сядзяць за картамі даміно, шахматамі. Двое асвабадзілі столі і граюць у пінг-понг. У адным з пакояў невялікая група пад акампанімэнт гітары сьпявае песьні барацьбы і песьні турыстых.

У другім пакоі—клюбная бібліотэка. У ёй 200 кніг і брошур, сьвежыя нумары „Юнге Гардэ“ і „Ротэ Фанэ“. Некалькі хлапцоў і дзяўчат сядзяць, захапіўшыся чытаньнем, яны нават не заўважаюць, хто праходзіць ля іх. У адным кутку стаіць малады комуністых і анты-фашысты і спрачаюцца з рабочымі, прымыкаючымі да соцыял-дэмакратычнага саюзу. Праведыры яму забаранілі наведваць комсамольскія вечары. Ня гледзячы на гэта ён прыходзіць і спрачаецца. Ён хоча сабе выразна ўявіць палітыку сваёй партыі і палітыку маладых комуністых. Ён адчувае, што яго партыя папірае нагамі кроўныя інтарэсы рабочых. Але ён яшчэ верыць, што яго партыя можа зьявіцца і падкупленыя праваднры могуць быць зьняты.

Юны комуніст выкладвае яму аргумант за аргумантам. Малады соцыял-дэмакрат толькі ківае галавой. Ён ніяк ня хоча прызнаць сябе пераможаным.

Загадчык клюбу, комсамолец, апавядае мне. Некалькі тыдняў назад, парашылі наш рабочы раён Арнсвальд стварыць юнацкі клюб.

Памяшканьне знайшлі хутка. За гэтае сутарэньне з нас узялі 40 марак (марка—46 кап.) у месяц.

Гэта было бруднае, не аклеенае памяшканьне, вільготныя сьцены.

Мы вышукалі гліны, цэменту, фарбы, каб пакоям надаць жылы выгляд. Правялі электрычнасьць. Затым пачаліся клопаты аб сталох, крэслах, лаўках, шафах, кнігах. Да ўсіх і партыйных таварышоў нашага раёну, да беспартыйных рабочых хадзілі і зьбіралі ў іх старую мэблю, якая валялася на сутарэньнях. Адзін соцыял-дэмократ увесь час дапамагаў нашай рабоце, ён прыходзіў кожны вечар, працаваў з намі і ўсё дапытваўся, ці хутка мы адчынім клюб.

Мы працавалі да позьняй начы, праз 14 дзён наш клюб быў гатовы. Ён патрабуе, бязумоўна, яшчэ шмат чаго. Не хапае сталоў, крэслаў, але нічога ня зробіш—наш заработак занадта бедны. Давозі таго, што мы маем грошы на кватэрную плату. Нашы партыйныя таварышы, якія працуюць, згадзіліся аплачваць адну марку ў месяц на ўтрымліваньне клюбу.

Акрамя таго, мы здабылі яшчэ нямнога грошай, стварыўшы кніжную латарэю.

Самае-ж важнае тое, што мы ў клюб прыцягнем беспартыйную моладзь, каб ў далейшым уцягнуць яе ў рады комсамолу.

Клюб штодзенна адчыняецца а 2 гадзіне. Да вечару гульні і адпачынак. Затым пачынаюць працаваць гурткі і рабочыя курсы. Мы хочам у яго ўцягнуць шырокія масы пролетарскай моладзі. Наш клюб павінен быць школай комунізму.

О. Вэйс

ПАЧЫНАЕМ УСЕБЕЛАРУСКІ РЭЙД „ЧЫРВОНАЗЬМЕНАЎЦАЎ“

Юнкораўская армія, выходзь на фронт!

З сёнешняга дню мы пачынаем правядзеньне першага ўсебеларускага рэйду па ўсеагульнаму навучаньню і ліквідацыі няпісьменнасьці. Юнкорам юнкораўскім пастом і брыгадам „ЧЗ“ зараз-жа патрэбна ўключыцца ў гэтую важнейшую па значэньню працу.

РАЗГОРТВАЙЦЕ КУЛЬТМАНЭЎРЫ!

З 1-га красавіка па 15-ае ліпеня 1931 г. праводзіцца другі этап Усебеларускае культэстафэты.

З 15 сакавіка па 1 красавіка праводзяцца культманэўры, як падрыхтоўчы этап да культэстафэты.

Задачы культманэўраў выявіць усе недахопы на фронце культурнага будаўніцтва, популярызаваць сярод працоўных маршруты, культэстафэты, правесьці вучот і вэрбоўку культармейцаў (з рабочых, батракоў, асьветнікаў, колгасьнікаў, сялян беднякоў, серадлякоў і інш.). Улічыць усе сілы і сродкі на асобных вучастках культурнага будаўніцтва і правесьці ўсю падрыхтоўчую працу да другога этапу.

Асноўнымі задачамі культэстафэты зьяўляюцца: мобілізаваць працоўныя масы на барацьбу за выкананьне задач, пастаўленых партыяй у галіне культурнай рэволюцыі, на мобілізацыю грамадзкасьці па аснове адзінага культпляну, на замацаваньне посьпехаў і на поўную ліквідацыю прарываў на ўсіх вучастках культурнага будаўніцтва, на забесьпячэньне актыўнага ўдзелу ўсіх зьвеньняў народнай асьветы ў правядзеньні пасеўкампаніі.

Для кіраўніцтва культманэўрамі і культэстафэты у Н. К. А. утвораны штаб. Пры ўсіх Гарсаветах і Райвыканкомах таксама ўтвараюцца штабы, а там дзе штабы ёсьць—аднаўляюць іх працу. Пры сельсаветах і на прадпрыемствах, а таксама ў цэнтральных установах організуюцца тройкі.

Белдзяржвыдавецтва

Паскорыць выданьне падручнікаў

Заданьне па выданьню падручнікаў БДВ ня выканана.

Для першага концэнтру патрэбны 24 назвы, а выдана ўсяго 5.

Мэдаткам значна тармозіць выданьне падручнікаў. Рукапісы, якія паступілі на прагляд у мэтадком у сярэдзіне 1930 году, усё яшчэ „праглядаюцца“.

Значна затрымлівае выданьне падручнікаў друкарня. 30 назваў ляжыць там с 1930 году.

Паводле пляну політэхнізацыі патрэбны 30 кніжок, але выдана яшчэ толькі 7.

У большасьці кніжкі перакладзеныя з расійскай мовы.

БДВ павінна тэрмінова ліквідаваць гэты ганебны прарыў.

Вопыт працы брыгад трэба замацаваць. **У брыгады па складаньню падручнікаў неабходна прыцягнуць рабочых і колгасьнікаў.**

З фронту ўсеабучу

* Працай па ліквідацыі няпісьменнасьці ў Маслакоўскім сельсавеце (Копыскі раён) ніхто ня цікавіцца: ні комсамольская ячэйка, ні настаўніцтва, ні сельсавет.

Дзераза.

* У вёсцы Бахэтоўка, Шаршунскага сельсавету, лікпункт працуе здавальняюча. Наведваюць лікпункт усе няпісьменныя, што маюцца ў гэтай вёсцы.

Розум Грыгор.

* Касьцюковіцкі райвыканком ужо другі год будуе школу ў вёсцы „Прусінава-Буда“, але школа ня збудавана і на сёнешні дзень. Вучням не мадзе вучыцца, прыходзіцца займацца, вандруючы па сялянскіх хатах.

Захар Янка.

* Комсамольцы і піонэры Засл... скай школы колгаснай моладзі адгрузілі 11 вагонаў дроў. Выручаныя сродкі пойдуць на дапамогу бедным вучням.

Дэвткор Алесь Левін.

* У Квашынскім лікпункце (Гарадоцкі раён) з ліквідацыяй няпісьменнасьці справа абстаіць дрэнна: у адзін вечар прыдзе многа вучняў, а на другі вечар прыдзе адзін-два чалавекі.

Комсамольская ячэйка ня цікавіцца жыцьцём школы, сельсавет таксама нічога не зрабіў, каб палепшыць працу школы.

Сумны.

Паведамленьне

ЦБ ДКО ЦК ЛКСМБ гэтым паведамляе аб прыёме супрацоўнікаў у організоўваемы пры ім тэатр для рабочай дзетвары з рабочых самадзейных гурткоў клюбаў і рабочай моладзі не маладзей 18-ці год.

Пры паступленьні неабходны наступныя дакуманты: а) аб соц.становішчы, б) месца працы, в) адукацыя, г) аб становішчы здароўя, д) заява.

Апошні тэрмін падачы заявы—23-III-г. г. Адрэс: г. Менск, Карла Маркса—3. ЦК ЛКСМБ, пакой ЦБ ДКО, з 6-ці да 8-мі гадзін увечары штодзённа.—

ЦБ ДКО ЦК ЛКСМБ.

15 сакавіка ў 6 з паловай гадзін увечары, у памяшканьні Гаркому ЛКСМБ адбудзецца паседжаньне штабу „ЛК“ Менску.

Павінны зьявіцца наступныя таварышы:

Фрыдман (ГКК КП(б)Б), Кучараў (БДУ), Міцельман, Маршак („Комунар), Кузьнец (Саюзтранс), Амбражэвіч, Сапатухін („Энэргія“), Русак (Чыгунка), Каўнацкі (ГК ЛКСМБ), Чарняк („Кастрычнік“), Сідляро (Друкарня імя Сталіна), Дельчук („Бальшавік“) Зэльбер (Белдзяржбуд), Крэўскі (Менбуд), Радкевіч („Ударнік“), Мілюкоўскі (Дзяржплян), Пыбакоў (Саўбуд), Грымберг („Комунарка“) Сіньковіч (Абутковая), Кузьміч (Арх. Буд. тэх.) а таксама і начальнікі атрадаў „ЛК“ і „ЛК“ гораду Менску.

Штаб „ЛК“ г. Менску

Дом пісьменьніка

У нядзелю 15-га сакавіка творчы вечар БелАПП'у. Андрэй Александровіч зачытае свой новы твор „Нараджэньне чалавека“. Пасьля чыткі—абгаварэньне. Запрашаюцца рабочыя, літгуртоўцы, пісьменьнікі, настаўнікі, студэнты і ўсе, хто цікавіцца новым у літаратуры.

Пачатак а 7ай гадзіне

Праўленьне Дому Пісьменьніка

Адказны рэдактар—МІХ. ПЛАТ...

Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 5?9